# ФАРМІРАВАННЕ КАМУНІКАТЫЎНЫХ НАВЫКАЎ НАВУЧЭНЦАЎ У ЧАС ПРАВЯДЗЕННЯ СЛОЎНІКАВАЙ РАБОТЫ НА ЎРОКАХ ЧЫТАННЯ

***Самуйлава Т.У.,***
*навучэнка 2 курса Аршанскага ВДУ імя П.М.Машэрава, г.Орша, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Чыкаванава К.А.

Мэтай навучання беларускай мове ў пачатковых класах, у адпаведнасці з канцэпцыяй вучэбнага прадмета, з’яўляецца авалоданне вучнямі функцыянальнымі сродкамі беларускай мовы для эфектыўнага іх выкарыстання ў розных сітуацыях моўных зносін.

Дасягнуць дадзеную мэту складана, таму што школьнікі жывуць у рускамоўным асяроддзі, якое не вымагае ад іх кантактаў па-беларуску. Па сутнасці, адзінае асяроддзе, дзе вучні могуць ажыццяўляць камунікацыі на беларускай мове, – гэта ўрокі мовы і літаратурнага чытання ў школе.

На гэтым этапе ўзнікае супярэчнасць: з аднаго боку, вучні малодшых класаў у большасці ахвотна ўступаюць у зносіны адзін з адным, готовыя дзяліцца сваімі ўражаннямі, весці сумесную дзейнасць, а з другога боку, малы запас беларускай лексікі, які ў іх ёсць, замаруджвае працэс зносін. Дадзеная супярэчнасць часцей за ўсё прыводзіць да таго, што навучэнцы выказваюць свае думкі і меркаванні па-руску. Такім чынам, мэта моўнай адукацыі асобы не дасягаецца. Гэтымі поглядамі тлумачыцца актуальнасць абаранай тэмы даследавання.

Мэта работы – выпрацаваць сістэму практыкаванняў, выкарыстанне якіх на ўроках літаратурнага чытання дасць магчымасць сфарміраваць у малодшых школьнікаў навыкі камунікацыі на беларускай мове.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праводзілася ў агульнаадукацыйнай школе № 13 г.Оршы ў 2 “А”, 2”Б”, 3 “А”, 3 “Б” класах. У якасці матэрыялаў даследавання былі выкарыстаны: праграма па літаратурным чытанні, метадычная літаратура, прадукты вучэбнай дзейнасці вучняў. Для дасягнення пастаўленай мэты выкарыстоўваліся наступныя метады: наведванне і аналіз урокаў літаратурнага чытання, правядзенне назіранняў, анкетаванне, знаёмства з перадавым вопытам школы, гутаркі з настаўнікамі пачатковых класаў.

**Вынікі іх абмеркаванне.** Улічваючы малы слоўнікавы запас навучэнцаў па беларускай мове, асаблівую ролю на ўроках літаратурнага чытання настаўнік павінен адводзіць слоўнікавай рабоце, выкарыстоўваючы пры гэтым актыўныя формы яе правядзення.

Калі настаўнік самастойна растлумачыць сэнс незразумелага слова (часцей за ўсё шляхам перакладу на рускую мову) ці вучні прачытаюць значэнне слова ў слоўніку, размешчаным у падручніку пасля тэксту, то разглядаемае слова не стане набыткам школьніка, не ўвойдзе ў яго актыўны слоўнікавы запас.

Назіранні за дзейнасцю настаўніка пачатковых класаў, аналіз метадычнай літаратуры, уласны вопыт дазволіў абраць найбольш эфектыўныя, на наш погляд, прыёмы арганізацыі і правядзення слоўнікавай работы на ўроках літаратурнага чытання.

Адзін з прыёмаў, які падабаецца вучням і вымагае ад іх уласных разважанняў, – гэта дыдактычная гульня “Мы думалі, а выявілася…”. Настаўнік прапануе вучням, працуючы ў групах па 3 – 5 чалавек, запоўніць табліцу, першая калонка ў якой – слоўнікавае слова, у другой – вучні пазначаюць свае меркаванні наконт яго значэння, а ў трэцяй – фіксуюць сапраўднае значэне прыведзенага слова. Спачатку, абмяркоўваючы, вучні запаўняюць другі слупок табліцы: выказваюць думкі, меркаванні наконт таго, што абазначае прыведзенае слова. Пры гэтым у работу актыўна ўключаецца мысленне (падбор сінонімаў, слоў па аналогіі, прадбачанне і г.д.), вусная мова вучняў, бо для абмеркавання ім неабходна ўступіць ва ўзаемадзеянне з іншымі. Трэці слупок дапамогуць запоўніць так званыя “эксперты” – вучні, якія працавалі ў гэты час са слоўнікамі розных тыпаў (з перакладнымі, сінонімаў, тлумачальнымі) і ў дадзены момант могуць адкарэкціраваць адказы сваіх таварышаў. Слоўнікавыя словы ў табліцы трэба прыводзіць у кантэксце, гэта дапамагае вучням разабрацца ў значэнні слова, нават калі і не ўсе здолеюць іх зразумець, то некалькі разоў прачытаюць словазлучэнне ці сказ з новым словам, а значыць усвядомяць, у якім выпадку можна яго ўжыць.

Для фарміравання ўмення ўжываць слова ў кантэксце, а таксама для развіцця адчування мовы, настаўнік прапаноўвае вучням знайсці ў сказе слова, ужытае ў неўласцівым яму кантэксце, і перабудаваць сказ, выправіўшы памылку.

Фарміраванню навыкаў калектыўнай работы, развіццю камунікатыўных навыкаў спрыяе арганізацыя работы ў групах. Групе вучняў прапануюцца словы, аб’яднаныя агульнай тэматыкай (рода-відавыя паняцці, напрыклад: вопратка (хустка, кашуля, спадніца, чаравікі, берэт)), навучэнцы павінны вызначыць, на падставе чаго словы аб’яднаныя ў адну групу, скласці палілог з прапанаванымі словамі, абыграць складзеную сітуацыю. Адна з галоўных умоў – у прад’яўленні вынікаў работы павінны быць задзейнічаны ўсе вучні групы.

Дапамагае замацаванню слоўнікавых слоў на ўроках літаратурнага чытання сістэматычнае выкарыстанне “Хвіліны гаварэння”. Сутнасць дадзенага прыёму наступная: пасля таго, як раскрыта значэнне незразумелага для вучняў слова, школьнікам прапануецца скласці звязны тэкст пра гэтае слова, раска-



Репозиторий ВГУ

заць усё, што з ім звязана, выказаць свае пачуцці па дадзенаму слову, магчыма, прыгадаць нейкі ўчынак ці падзею, якая асацыіруецца са слоўнікавым словам. Выказванне вучня займае роўна адну хвіліну, пасля сканчэння якой слова даецца іншаму. Прыём "Хвіліна гаварэння" спрыяе развіццю індывідуальнай свядомасці, мыслення і творчага ўяўлення школьнікаў.

На этапе замацавання слоўнікавых слоў, паверкі дамашняга задання мэтазгодна выкарыстаць гульню "Сапёр": настаўнік прапануе словы з мастацкага тэксту, які вывучаўся на папярэднім уроку, вучань раскрывае значэнне прыведзеных слоў да першай дапушчанай памылкі, калі яна будзе зроблена (бо "сапёр" памыляецца толькі аднойчы). Перамагае той вучань-"сапёр", які не дапусціць пры тлумачэнні слоў ніводнай памылкі.

У час даследавання было праведзена анкетаванне вучняў двух другіх і двух трэціх класаў агульнаадукацыйнай школы. Вучні другіх класаў адказвалі на прапанаваныя пытанні 20 снежня 2016 г., вучні трэціх класаў – 7 лютага 2017 г. Настаўнікі даследуемых класаў выкарыстоўваюць актыўныя метады правядзення слоўнікавай работы на ўроках чытання. Вынікі анкетавання прадстаўлены ў табліцы ніжэй:

| Клас | Вы цалкам разумееце сэнс таго, што гаворыць настаўніца па-беларуску на ўроку чытання? | Вам лёгка ўступіць у зносіны па-беларуску з вучнямі свайго класа, настаўнікам? | Правільна адказалі на пытанні анкетуючага | Склалі звязнае выказванне з прапанаванымі словамі |
|---|---|---|---|---|
| 2-і (43 чалавекі) | 48,8% (21 вучань) | 20,9% (9 вучняў) | 44,2% (19 вучняў) | 27,9% (12 вучняў) |
| 3-і (41 чалавек) | 95,1% (39 вучняў) | 75,6% (31 вучань) | 90,2% (37 вучняў) | 97,6% (40 вучняў) |

Вынікі праведзенага анкетавання сведчаць пра тое, што сістэмнае выкарыстанне актыўных прыёмаў работы са слоўнікавымі словамі эфектыўна ўплывае на развіццё ў вучняў навыкаў камунікацыі на беларускай мове. Акрамя гэтага, цікавасць вучняў да ўрокаў беларускага літаратурнага чытання ўзрастае, павялічваецца актыўнасць школьнікаў у час заняткаў, удасканальваюцца мысленчыя аперацыі школьнікаў і інш.

**Заключэнне.** Такім чынам, аналіз метадычнай літаратуры, перадавога вопыту школы, праведзенае даследаванне дазволіла выпрацаваць пэўную сістэму практыкаванняў, выкарыстанне якіх на ўроках літаратурнага чытання на этапе слоўнікавай работы садзейнічае фарміраванню камунікатыўных навыкаў вучняў на беларускай мове. Дадзеная сістэма грунтуецца на выкарыстанні актыўных праёмаў навучання, што пабуджае школьнікаў да ажыццяўлення камунікацыі і развівае іх актыўны слоўнікавы запас.

Літаратура:

1. Короткевич, З.В. Развитие критического мышления учащихся начальных классов посредством чтения и письма / З.В.Короткевич, Е.В.Маскевич. – Мозырь: Содействие, 2008. – 120 с.

## THE ROLE OF THE FORM-MASTER IN EDUCATING YOUNGER GENERATION IN THE MODERN SCHOOL

***Chernyak K.S.,***
*english teacher, Gymnasium № 1 Orsha, Republic of Belarus*

In the work of almost every teacher has a difficult but very important mission - to be the class teacher. Some teachers believe this work an additional burden to their teaching activities, others call it the most important. No matter how complicated the work of the class teacher, without a doubt, it is necessary to children as the main structural unit is a class in the school. It is here that organized cognitive activity, social relations are formed among students. The class implements the care of social well-being of children, solved the problem of their leisure time, carried out the initial consolidation of teams, formed corresponding to the emotional atmosphere.

The aim of this work is the most profound, detailed and accurate review of the activities the class teacher.

**Material and methods.** The material studied in this pedagogical research is the process of activities of the class teacher. Method is descriptive.

**Results and discussion.** The status of the class teacher at the school is the main subject of educational work with parents. It produces the basic strategy and tactics of the interaction of the school and the family in the upbringing of the individual student; being an expert in the field of pedagogy and psychology, it helps parents to resolve the contradictions of family education. The adjustment of the educational social environment influences. These tasks are defined by the status of the class teacher. We must not forget that the family education - it is private, intimate and family. Parents themselves determine the fate of her child. Have a hollow right to their own teaching position, his style and tone of the relationship with the child, his own attitude to pedagogical influences society and school, respectively. Therefore, the class teacher, guided by a sense of pedagogical tact, in the



Репозиторий ВГУ